Сяргей Грахоўскі



# Сонечная сцежка

Сяргей Грахоўскі




ВЕРШЫ

МАСТАК Ю. ЗАЙЦАЎ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1980



## СУНІЧКІ

Каля поўнае крынічкі
Пахаваліся сунічкі
Пад сцяблінкі і лісты
І за ельнічак густы.

З раніцы да ночкі
Бомкаюць званочкі,
Галасочкам тонкім
Клічуць іх рамонкі.

Сойкі і сінічкі
Свішчуць: «Дзе сунічкі?»
І ўсю ноч крычыць сава:
«Я шукаю іх сама!»

Абазваліся сунічкі:
«Мы хаваемся, як знічкі,
Прыпадаем да зямлі,
Каб адразу не знайшлі,
Каб з травой і зеллем
Зайчыкі не з'елі.
Любім мы свае лясы,
Любім вашы галасы,
Хто не вельмі ганарыцца,
Нам павінен пакланіцца.
Калі схіліцца хоць раз,
Пад лістамі знойдзе нас».

І чырвоныя суніцы
Зніклі зноў, як чараўніцы.







© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1980.

## ЗЕМЛЯКІ

Яшчэ нядаўна хлапчукамі
Былі салдацкія сыны,
А ўжо маленькімі рукамі
Да зор цягнуліся яны...

Давалі ім заўсёды сілы
Прасторы роднае зямлі,
І вось прарэзаліся крылы
І над сусветам паднялі.

У космас, у камандзіроўку,
Яны лятаюць і пяюць.
І Белае, і Камароўку
З касмічных даляў пазнаюць.

І, пралятаючы над светам
У самым хуткім караблі,
Здалёк падміргваюць планетам
Сыны шчаслівае зямлі.

У кожным з нас жыве з пялёнак
Пятро Клімук і Кавалёнак.
На віражах касмічных трас
Даўно чакаюць зоры нас.



## ЗНАХОДКА

Аднойчы разявака нейкі
Згубіў на бруку дзве капейкі.
Паміж халодных галышоў
Я на дарозе іх знайшоў.
Знаходцы радаваўся я.
Пасля падумаў: «Ці ж мая,
Хоць і маленькая, манетка?»
А на мяне адзіны сведка
Глядзеў, здавалася, з папрокам
Прыжмураным і хітрым вокам,
Цягнуўся мордаю да рук
Разумны і калматы Жук.
Я ўпершыню манетку меў,
Але папрок той зразумеў
І прыляпіў да агароджы
Аб'яву, што знайшліся грошы.
І адрас я паведаміў.
Пасля заснуў і сон прысніў,
Што ў суседскага Андрэйкі
Не хапае дзве капейкі
На карычневы аловак,
Каб закончыць загаловак
І выдатнікаў партрэты
Для насценнае газеты....

Сніцца: бабка іх згубіла
І дамоў не пазваніла.
Мо згубіў сівенькі дзед,
І не хопіць на білет.
Спаць пытанне не дае:
«Ну, чые яны, чые???»
І пачуў такі адказ:
«У дарозе мы ўвесь час.



Дзе мы толькі не жылі,
У каго мы не былі:
У мяшэчках і ў кішэнях
Нас вазілі на аленях,
На машынах, цягніках
І насілі ў рукзаках.
Мы былі ў прасторных хатах
І ў жалезных аўтаматах,
Нас часамі і ў палёт
Браў у Арктыку пілот,
І па моры мы плылі
На вялікім караблі,
Выпадкова нас матрос
Аж у Афрыку завёз.
Адпраўляюць часта нас
У глухія схovы кас.
Там капеек вельмі многа,
Але кожную дарога
Ў розныя вядзе бакі,
Мы ж усе вандраўнікі.
Мы былі ў пенсіянера,
Пабылі і ў піянера,
Кінуў нас адзін салдат
У тэлефонны аўтамат.
Нешта там усё гуло,
Але весела было
І ў пахмурны дзень вясновы
Слухаць розныя размовы.
Людзі часта гаварылі,
Што купілі, што зварылі,
Дзе хадзілі, дзе былі,
Што далі і што ўзялі.
Чулі мы, як для старога
Выклікалі дапамогу,
А ў дачкі пытала маці,



Ці яна прыбрала ў хаце.
Вандравалі мы далёка —
З Брэста да Ўладзівастока,
Пабывалі мы ў шахцёраў,
Трактарыстаў і шафёраў.
А пасля свавольнік нейкі
Нас цішком паклаў на рэйкі,
Але мы з-пад кола ўдала
Пакаціліся на шпалы.
Грукатаў цягнік над намі,
Пралятталі дні за днямі,
Але нас на дне кювета
Падняла дзяўчынка Света.
Мы падзякавалі Свеце
І пайшлі гуляць па свеце.
Ад Масквы і да Чукоткі
Шлях не лёгкі, не кароткі:
Часам падалі на брук,
Пабывалі ў сотнях рук,
Дужых, мяккіх, вузлаватых,
І пяшчотных, і шурпатых,
Пад зямлёй і на зямлі
Нас усюды берагллі.
Нас лягчэй за ўсё згубіць,
Але цяжка зарабіць».



Сон закончыўся кароткі.
Болей мне не да знаходкі:
Пабягу я да Андрэйкі
І аддам яму капейкі.
Можа, купіць ён аловак
І закончыць загаловак,
І шарады, і партрэты
Для насценнае газеты.

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗЯМЛЯНКА

Сонца раненька ўзыходзіць,
Лес у росным серабры.
Па грыбы на золку ходзяць
Неразлучныя сябры.

Вася з Мішам наігліцу
Селі трохі адпачыць.
Звонка ціўкаюць сініцы,
Свішча дрозд, жаўна крычыць.

А як выйшлі на палянку,
За ламаччам у галлі
Партызанскую зямлянку
Каля копанкі знайшлі.

Паглядаюць піянеры
Праз адчыненыя дзверы:
Пасярод зямлянкі стол
Хмызняком зарос наўкол,
Кацялок іржа праела,
І зямлянка ўся асела,
Сцены мохам зараслі,
А на ўтоптанай зямлі,
Нахіліўшы голле ўбок,
Малады расце дубок.
Міша кажа:
— Быў мой тата
Тры гады лясным салдатам,
Можа, ў гэтым будане
Жыў з сябрамі на вайне.
— А майму заўсёды дзедку
Даручаў камбрыг разведку:
Партызанаў на змярканні

Праз балоты і кусты
Ён праводзіў на заданне —
Рваць чыгунку і масты.
І ляцелі пад адхоны
Фрыцаў поўныя вагоны.
Ды знікалі ў гушчары
Дзед і дзедавы сябры.
Вёў граміць назаўтра ён
Паліцэйскі гарнізон.
Дзеду нашаму далі
Аж чатыры медалі.
Тут варыла бабка наша
Партызанам суп і кашу
І з трафейным пісталетам
Па грыбы хадзіла летам.
Села раз каля ракі
Перабраць баравікі —
Абразае, ў кош кладзе,
Паглядае ўлева, ўправа.
Чуе — каля пераправы
Нешта боўтае ў вадзе.
Адпаўзла за куст парэчкі
І прылегла на траве.
Пасярод імклівай рэчкі,
Бачыць, — тоўсты фрыц плыве:
Размарыла, мабыць, спёка.
Ад вады непадалёку
Ён паклаў каля калоды
Аўтамат, пілотку, боты
І з бразголкамі мундзір:
Мабыць, нейкі камандзір.
Вось да берага прастуе,
Пакрактаў, на спіну лёг.



«Я ж цябе тут пачастую,—
Кажа бабка: —
Хэндэ хох!»
Ухапіла аўтамат
І крычыць: «Папаўся, гад!»

Бабцы з берага відно,
Як ад страху, з перапуду
Тоўсты фрыц пайшоў на дно,
Хоць лаві яго на вуду.
«Ну, сядзі, сядзі, не дыш,
Колькі ж ты там прасядзіш?»
Доўга ўседзець немагчыма:
Выплыў, лыпае вачыма,
Стаў, да пояса ў вадзе,
А на бераг не ідзе.
І, як той асіны ліст,
Задрыжаў руды фашыст.

Так без ботаў, без мундзіра,
Хмызняком, каля сяла,
У атрад да камандзіра
Бабка фрыца прывяла.
— Слухай, Вася, мы сюды
Прынясём цвікоў, вады —
Столь паправім, стол памыем
І лясны музей адкрыем.
За зямлянкай у бары
Будуць зноў палаць кастры,
Зноў на гэтыя паляны
Папрыходзяць партызаны
І раскажуць нам тады
Пра ваенныя гады....



## ЖМУРКІ

Захацелі куркі
Пагуляць у жмуркі.
Раніцай за хатаю
Бегаюць стракатыя,
Чорныя і белыя,
Пудкія і смелыя.

Кажа Курка-рабка:
«Я ж усім вам бабка.
Не грабіце смецця,
Не лавіце мух.
Падыходзьце, дзеці,
І пастаньце ў круг.
Вунь яшчэ адна імчыцца...
Сталі ўсе?
Пачнём лічыцца:
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
Каршуны не хочуць спаць,
Хочуць есці, хочуць піць,
Хочуць пеўніка ўхапіць,
Але курачка адна
Праглынула каршуна.
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
А табе ісці шукаць».
Завязалі пеўню вочы
Шоўкавай травою,
Стала цёмна, як уночы,
Круціць галавою.
Ходзіць певень каля хаты
І ўздыхае горка:
Зніклі нават кураняты
Некуды з падворка.
Бегаў певень да змяркання,

І расла трывога,
Што не выканаў задання —
Не знайшоў нікога.

Слепнуць куры, як сцямнее,
Кожная гукае,
І ніяк не зразумее,
Хто каго шукае.
Дзе куратнік — невядома,
Хто прыціснуў лапку...
І нарэшце ўсіх дадому
Пазбірала бабка.

Зноў яна старанна лічыць,
Бабка добрай ночы зычыць:
— Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Каршуны палеглі спаць.
Спіце, пеўнікі і куркі...
Заўтра ў што гуляць?

— У ЖМУР-КІ!

## ПАЖАРНЫ

Служыць Певень у пажарнай,
Бо не любіць працы марнай.
Ён хваліўся:
— Я ўзлячу
На любую каланчу.
І ўзляцеў на важны пост.
Толькі вецер трэпле хвост,
Грабянец і бараду
Певень гладзіць на хаду.

А наўкол яго — прасторы:
Поле, луг, лясы, азёры,
Неба сіняе над ім,
Але ў небе ... белы дым.
Не іначай — паміж хмар
Пачынаецца пажар.
«Што рабіць?» — падумаў ён
І пачаў званіць у звон,—
Аж за лесам загуло
Невялікае сяло.
Пакацілася:
— Тры-во-га!
Стала вузкаю дарога:
Да пажарнае з-за рэчкі
Беглі коні і авечкі,
Напалоханыя козы
Выціралі зеллем слёзы.
Гусі, качары і качкі
З помпамі цягнулі тачкі,
Аж над шляхам пыл курыць.
Ўсе пытаюць: «Дзе гарыць?»
Носяць вёдры да ракі,
Расхапалі бусакі
І бягуць да каланчы:
— Гэй, пажарны, не маўчы!
— Што гарыць? Няўжо сяло?
— ...
— Мабыць, мову адняло.
Тут і Курка прыляцела:
— Я даўно сказаць хацела,
Што цыбаты недарэка
Здатны толькі кукарэкаць.
Вось вазьму за бараду
І парадак навяду!
Ну, ці будзеш гаварыць,



Дзе пажар і што гарыць? —
Певень глянуў угару:
— Хутка я і сам згару.
Ці не бачыш — паміж хмар
Пачынаецца пажар.
— Ах, ты дурань, дармаед!
Гэта ж самалёта след.
Лепш падумаў бы. А ён
Пачынае біць у звон.
Певень кажа:
— Не крычы.—
І зваліўся з каланчы.

## КОЛА

Хто прыдумаў першы кола?

Можа, Янка ці Мікола.
Хлопец стаў на бервяно,—
Пакацілася яно
З крутаяру напрасткі
Да шырокае ракі.
Янка стаў на чурбанок,—
Пакаціўся ён убок,
А як вырваўся з-пад ног,
Утрымаць ніхто не мог.
Сталі хлопцы варажыць:
Як ён сам з гары бяжыць
І сасну якая сіла
Аж да рэчкі дакаціла?

Каб забавіць хлапчукоў,
Нарабілі круглякоў.
Выпаў стрыжань з аднаго.
На дручок уздзеў яго
Нейкі хлопчык канапаты
І пагнаў да самай хаты.
Ён дамоў прыбег вясёлы
І зрабіў чатыры колы.
Два надзеў на палку.
«Вось,
Гэта будзе звацца вось».
Два другія змацаваў,—
Каламашкаю назваў.

І яна пабегла з дому
Ў свет праз пушчы і палі...
Толькі добра невядома,
Дзе бацькі хлапца жылі.
«Дзякуй» бы сказаў ім я,
Ды не ведаю імя.

Можа, Янка ці Мікола
Першае прыдумаў кола.

Мо даведаліся б вы,
Хто з яго радні жывы.



## ДЗЯЦЕЛ

Я на елку палячу —
І галінкі палячу:
Дзюба ў мяне доўгая,
Буду стукаць доўга я.
Назіраю я гады,
Як буяюць ягады:
З журавін зрабіў карал —
Журавы мяне каралі,
А суніцы ледзь паспелі,
Іх дразды скляваць паспелі.
Я спалохаў іх як след,
І прастыў птушыны след.
Прахаплюся я са сну
І на елку ці сасну
Зноў на досвітку лячу —
Дрэва хворае лячу.



## МЛЫН

Многа клопату мы мелі:
Млын паставілі на мелі,
Але ён зусім не меле,
Бо, відаць, зрабіць не ўмелі.

— Можа, я парадую
Добраю парадаю?
— Ты старэйшы, выручай!
— Загаціце вы ручай.

Гаць зрабілі, а па нас
Прыімчаўся Апанас.
Кажа мне:
— Каля ракі ты
Назразай хутчэй ракіты,
І няхай з яе Мікола
Для млына змайструе кола,
Загудзе яно на мелі
І з пяску мукі намеле.

## У ЛЕСЕ

Хто, гуляючы па лесе,
На высокі дуб палезе?
Хто, прыйшоўшы у лясы,
Не заўважыць след лісы?

Я на пень усеўся лысы,
Бачу — тут гулялі лісы,

Я на дуб узлезці б мог,
Каб пад ім быў мяккі мох.

Пад бярозаю ляжу,
І бярозавік ліжу:
Смага паліць, а вады
Не знайсці, бо авады,
Быццам хмара, наляцелі —
Пухіры гарацць на целе.
Я другі адзену ўбор
І пайду гуляць у бор.

**ЛАСЯНЯ**

Горка плача ласяня.
З лесу збеглася радня:
Тата,
Мама,
Бабка,
Дзед,
Брат,
Сястрычка
І сусед.
Плача, енчыць ласяня:
— Не дажыць, відаць, да дня:
Паліць, торгае, скубе
За вушамі і на лбе,
З боку ў бок мяне вядзе,
Галава, як звон, гудзе,
Боль свідруе галаву.
Не, да дня не дажыву.

Плача мама, плача татка —
Ўсе шкадуюць ласянятка,
Плачуць брат, сястра, сусед,
Але ўсіх суцешыў дзед:
— Пацярпі, дзіцятка, трошкі —
Бо ў цябе вылазяць рожкі.



## ХТО НЕ СПІЦЬ ДА РАННЯ

На высокіх тонкіх лапках
Ноччу ходзіць Сон у тапках,
Над сабой трымае ён
З ясных зорак парасон.
Паміж зорак на бачок
Срэбны лёг маладзічок.
Па дарожцы, ля акон,
Ледзьве чутна ходзіць Сон.
Сам не спіць і спаць не хоча,
А табе заплюшчыць вочы.
Ён ужо стаіць на ганку
І спявае калыханку:

Спі, дзіцятка,
Люлі, люлі,
Галубы даўно
Паснулі,
За шпакоўню вераб'і
Не вядуць ужо
Баі.
Спяць дразды,
І спяць шпакі,
Спяць у рэчцы
Шчупакі,
Спіць даўно
Ў закутку мыш,
Толькі ты адзін
Не спіш.
Сон даўно змарыў
Бабра,
І табе заснуць
Пара.



Стала цёмна на двары,
Сціхлі лютыя вятры,
Тухнуць у дамах агні —
Горад спіць у цішыні.
А на вуліцы Шырокай
Да світання чутны крокі,
Гэта міліцыянер
Абышоў двары і сквер,
Хоць і дождж сячэ у твар,
Ён адзін тут гаспадар.
Свішча вецер з-пад маста,—
Не пакіне ён паста.
Ён да рання спаць не будзе,
Каб спакойна спалі людзі,
Каб мігалі, быццам зоры,
На праспекце светафоры,
Каб на вуліцы да дня
Быў спакой і цішыня.
Не кладуцца спаць уночы
Інжынер, манцёр, рабочы
І працуюць, каб было
У дамах заўжды святло,
Каб гарэлі да зары
На праспекце ліхтары.
На мастах, на плошчах гулкіх,
На праспектах і ў завулках
Кожны вахту з іх трымае,
Каб тралейбусы, трамваі
Ад прыпынку да прыпынку
Бегалі без перапынку.
Каб пякарні і заводы
Працаваць маглі заўсёды.
Каб на вуліцах было
Электрычнае святло.
З вечара і да зары





Цеста месяць пекары,
Каб табе, як пройдзе сон,
На сняданне быў батон,
Каб скаціліся уранку,
Быццам сонцы, абаранкі,
З макам булачкі і сушкі,
Жытні бохан і ватрушкі,
Каб паветра аж да неба
Пахла свежым цёплым хлебам.

На шляхах гудуць маторы —
Па начах не спяць шафёры:
Едзе цэлая рака
У цыстэрнах малака.
І яшчэ вязуць шафёры
Агуркі і памідоры,
Апельсіны, вінаград
Для цябе ў дзіцячы сад.

Хто ж яшчэ не спіць уночы?
Не заплюшчыць доктар вочы:
Толькі дзынкне тэлефон,
З медсястрою разам ён
Паімчацца па дарозе
Зноў на «хуткай дапамозе».
Не спазняюцца ўрачы
У бядзе дапамагчы.
Хто яшчэ не спіць ўночы?
Бортмеханік, штурман, лётчык.
Хоць і поўнач,
                у палёт
Іх адправіць самалёт,
Бо ў Чыце і на Таймыры
Іх чакаюць пасажыры.
Праз туман яны густы

І газеты, і лісты
Прывязуць заўсёды ў час
Ў новы горад і ў калгас,
Бо заўсёды ўсе павінны
Ведаць свежыя навіны.
Спаць начамі не прывык
І дзяжурны паштавік:
Ноччу родным і сябрам
Шлюць нямала тэлеграм,
І ў Хабараўск і ў Масты
Адпраўляе ён лісты,
У раён, і ў сельсаветы
Прыйдуць свежыя газеты,
Што да ранішняй пары
Друкавалі друкары.
І газет і пісьмаў тоны
Ноччу грузяць у вагоны.
Павядуць цягнік са свістам
Па чыгунцы машыністы
Праз палі, лясы і горы
У бязмежныя прасторы.
Хто яшчэ не спіць уночы?
Пагранічнік жмурыць вочы,
Углядаючыся ў змрок,
Чуе кожны рух і крок.
Ноч сляпая і нямая,—
Ён чужынца затрымае
І на варту стане зноў
Нашых радасцей і сноў.
Каб жылі спакойна ў свеце
І дарослыя, і дзеці,
Наша Родная Краіна
Лепшага паслала сына,
Каб у дождж і ў навальніцу
Вартаваў сваю граніцу.

Праляцела ноч.
І Сон
Склаў свой зорны парасон.
Птушкі свішчуць,
сонца свеціць,
Уставайце дружна, дзеці!
Надышоў пагодны ранак:
Смачна пахне абаранак,
На стале батон чакае,
Малако і кубак чаю.
Сем гадзін без дзесяці —
Трэба ў сад хутчэй ісці.
Вось і вуліца прамая,
А па ёй бягуць трамваі,
Шапацяць па бруку шыны,
І ляцяць, ляцяць машыны.
Ручку маміну трымай,
Як садзішся ты ў трамвай.
А ў трамваі сівы дзед
Разглядае стос газет.
Гэтак многа!
Мабыць, ён
Кіяскёр ці паштальён.
Ціха рыпнулі вагоны,—
Светафор гарыць зялёны,
Аж у вочы б'е прамень.
Шлях адкрыты!
Добры дзень!





## СОНЕЧНАЯ СЦЕЖКА

Жоўты лісцік тапаліны
Ціха падае з галіны,
І лісты, лісты наўкол
Апускаюцца на дол:
Высцілае лістапад
Сцежку ў наш дзіцячы сад.

Спрытна ходзяць ножкі
Сонечнай дарожкай.
Кожнай раніцай з ахвотай
Мы прыходзім на работу:
Ляльку трэба расчасаць
І кружочкі напісаць,
Збудаваць пясчаны дом,
З'есці кашу з малаком
І кату пачысціць боты.

Ой, як многа ў нас работы!





## ЛЕТА

Прыходзіць лета звонкае
Птушынаю гамонкаю,
Над сінімі азёрамі
Яно ўзыходзіць зорамі,
А пахне медуніцамі
І спелымі суніцамі.
Прыходзіць лета сцежкамі
З малінай, сыраежкамі,
Частуе на пагорку
Арэхамі вавёрку,
На возеры, ля берага,
Гукае зайца шэрага.
Прыходзіць лета звонкае,
Шуміць бярозкай тонкаю,
Гамоніць лес густы,
Дык не праспі і ты:
У спёку або ў дождж
Імчыся басанож...
Куды ні глянь — усюды
Цябе чакаюць цуды,
Цябе чакаюць сцежкі
І радасныя ўсмешкі,
Лугі, лясы, палі
І шчасце на зямлі.



## СЕНАКОС

Травы спелыя шумяць.
Ідуць касцы на сенажаць.
Кожны важны, хоць і босы,
На плячах мільгаюць косы.
Склалі торбачкі, біклажкі
І ўзяліся за мянташкі.
Вострацць косы на мяжы —
Пахаваліся вужы,
І ад страху жабкі
Пагублялі тапкі.
Звон стаіць ад звонкіх кос —
За пракосам лёг пракос.
Ў чорных фраках, як паслы,
Ходзяць важныя буслы.
Ад спякоты загарэлі,
Ад работы аж змакрэлі:
Рэжуць дзяцельнік густы,
Абкасілі тры гнязды,
Разагналі дзікіх вос,
Косы склалі пад пракос,
Накасіўшыся як след,
Ўсе паселі на абед.
Ім прынеслі бусляняткі
Хлеб і цёплыя аладкі,
Пад ракітай бусел-дзед
Кроіць лусты на абед,
Раздае яго дачка
Ўсім па кубку малачка.
А як добра закусілі,
Луг да рэчкі дакасілі.
Як адзін, назаўтра зранку
Ўсе пакінулі буслянку —
Выйшлі дружна на лугі
Ставіць копы і стагі.
Носяць сена дзед і тата,
Памагаюць бусляняты,
А вярнуліся ў сяло,
Кажуць:
— Весела было!



## ГУСІ

Па багуне і верасе
Сівы туман плыве,
То сцелецца па беразе,
То па сухой траве.

Вада, густая, сіняя,
Палошча валуны,
І першым хрусткім інеем
Паблісквеюць чаўны.

А над лугамі стылымі
Пачаў усход гарэць,
Лапочуць гусі крыламі,
Бо хочуць паляцець

На берагі спякотныя
Далёкае зямлі,
Як птушкі пералётныя,
Што ў вырай паплылі.

Лапочуць гусі крыламі,
Крычаць — займае дух,
Ды не хапае сілы ім
Пераляцець за луг.

Трывожна гусі белыя
На воблакі глядзяць,
Ды толькі, пацяжэлыя,
Да іх не даляцяць.

Саслаблі крылы дужыя
Ад лёгкага жыцця...
Ідзе зіма са сцюжаю,
І ўслед снягі ляцяць.

## РАЗВІТАННЕ

Я скачу, і Лора скача,
Хоць развітвацца пара:
Едзе наш дзетсад на дачу,
У Артэк ляціць сястра.

— Самалётам?
— Самалётам!
І яшчэ машынай потым
Будзе доўга ехаць Лора
Аж на самы бераг мора.

Мы ж паедзем у Крыніцы,
У густыя сасцякі,
Там — суніцы і чарніцы,
А ў бары — баравікі,

Там званочкі і рамонкі
І шпакі спяваюць звонка,
На буслянцы аж да ночы
Бусел весела клякоча.

Лора мне дала канверты
І сказала:
— Дойдуць, вер ты,
Я тут адрас напісала,
Каб атрымліваць лісты,
А калі канвертаў мала,
Папрасі у мамы ты.

— Я ж яшчэ пісаць не ўмею,
Я табе прышлю лілею,
А шыпшына расцвіце,
І яе прышлю ў лісце.

Трошкі я засумавала,
Бо гадоў мне вельмі мала,
Як дванаццаць налічу,
У Артэк я палячу.

Усміхаецца сястра:
— Будзь здарова! Нам пара!..



## ПАД ЧЫРВОНЫМ СЦЯГАМ

Золкі вецер у завулку
Гоніць жоўтыя лісты,
І гудуць ад ветру гулка
Дахі, плошчы і масты.

Барабанаў гулкі пошчак
Будзіць горад на зары.
Галубы ляцяць над плошчай
І чырвоныя шары.

Сёння свята! Сёння свята!
І выходзяць на парад
Нашы мамы, нашы таты,
Піянеры, акцябраты
І дзіцячы дружны сад.

А паперадзе калоны —
Дзед увесь у ордэнах,
У пятліцы — бант чырвоны,
У руках — прабіты сцяг.

Дзед у бітвах пасівелы,
Але радасны заўжды,
Браў з Чапаевым у белых
Вёскі, сёлы, гарады,

У тайзе пускаў заводы,
Як мінуў суровы час.
Камуністам быў заўсёды,
Слухаў Леніна наказ.

Пад прабітым тройчы сцягам,
Як Радзімы верны сын,

Вызваляў ён Мінск і Прагу,
Лодзь, Варшаву і Берлін.

Каб жылі шчасліва дзеці,
Як заціх ваенны гром,
Дзед на Ленінскім праспекце
Будаваў за домам дом.

За чырвоным сцягам следам
Добра кожнаму ісці
Разам з бацькам, разам з дзедам
На парадзе і ў жыцці.

## КАРАГОД ПАД НОВЫ ГОД

### (НАВАГОДНІ РАНІШНІК)

**Добры Чараўнік:** Нас не страшыць вецер колкі,
Ні мяцеліца, ні снег,
Бо гарацъ усюды ёлкі
І звініць вясёлы смех,
Бо да нас, нібыта ў казцы,
Едзе ў госці Дзед Мароз,
А за ім бяжыць у масцы
І Міколка-Паравоз.
*(Уваходзяць удзельнікі ранішніка ў масках.)*
Чарнамор, сагнуўшы спіну,
Моўчкі гладзіць бараду,
Айбаліт і Бураціна
Пасвяць зайцаў чараду.
І Нязнайка, і Вясёлкін
Разам з намі каля ёлкі
Сустракаюць Новы год.

А за імі без супынку
Першакласніцы-Сняжынкі
Дружна водзяць карагод.

І на сцэне ў гэты час
Скача «Бульбу» трэці клас.
Запыталася ў Мядзведзя
Ласяня, задраўшы нос:

**Ласяня:** А чаму дасюль не едзе
З падарункамі Мароз?

**Айбаліт:** Не хвалюйцеся. У час
Будзе Дзед Мароз у нас.
І не жартам, не на смех,
Прывязе гасцінцаў мех.
Ён адзін, а нас багата,
І сягоння ўсюды свята.
Мусіць ён да ўсіх паспець,
Так што трэба пацярпець.
Не бядуйце, не крычыце,
Лепш спявайце і скачыце.
Хай бяруць цымбалы Зайкі,
А Мядзведзі — балалайкі,
Памагаць на кантрабасе
Будзе ім Вясёлкін Вася.
*(Усе скачуць пад музыку.)*

**Чараўнік:** Добра мы і дружна пелі,
Але сані зарыпелі,
І шамкі звіняць, звіняць,
Мабыць, коней не суняць.
Акцябраты! Піянеры!
Адчыняйце насцеж дзверы:
Едзе ў госці Дзед Мароз
І Міколка-Паравоз.
Снег клубіцца, як аблокі.



У чырвоным кажусе
Дзед Мароз ружоващчокі
За плячамі мех нясе.
Дзед высокі і вясёлы,
Снег блішчыць на барадзе,
І Снягурачка да школы
За руку яго вядзе.
За Снягурачкай і Дзедам
Два хлапцы ступаюць следам.

**Дзед Мароз:** Добры дзень!
Са святам, дзеці!
Вас вітае Дзед Мароз.
Доўга ездзіў я па свеце
І да вас гасцей прывёз.
Мы з унучкаю былі
На другім канцы Зямлі.
З ёю мы ў далёкай Кубе
Запалілі ёлку ў клубе.
Навагоднія гасцінцы
Пасылаюць вам кубінцы.

**Снягурачка:** Да палярнікаў на лёд
Нас даставіў верталёт,
А пасля ў Алма-Ату
Паляцелі мы на «ТУ»,
Хоць зімою там былі,
А цалінныя палі
Абышлі ад краю ў край —
Будзе добры ураджай.
Дружнай песняй па-шахцёрску
Нас віталі ў Салігорску,
А да чорнае ракі
Прывялі нафтавікі.
На Урале нас і ў Брацку
Абдымалі ўсе па-брацку...

**Дзед Мароз:** Для маёй Снягурачкі
Кажушок і бурачкі
З ясных зорак дзень у дзень
Шыў на Поўначы Алень.
Развяжы, унучка, мех
І дастань з яго арэх,
Незвычайны, залаты
І заўсёды непусты.

**Снягурачка:** Мне арэх далі вавёркі,
Раскалю, а ў ім — пяцёркі,
Хто іх любіць, хто іх мае,
Падарункі атрымае.
*(Раздае падарункі лепшым вучням.)*
Каб не быў арэшак горкі,
Каб штодня хацелі пець,
Я жадаю ўсім пяцёркі
У наступным годзе мець...
Дзед загадку загадае
І нікога не міне,
Бо для ўсіх, хто пажадае,
Ёсць гасцінцы і ў мяне.

**Дзед Мароз:** Ну, загадку дык загадку.
Пачынаю па парадку:
Той сляпы, глухі, бязрукі,
Хто ўцякае...

**Галасы:** Ад на-ву-кі.

**Дзед Мароз:** Адгадалі. Малайцы!

**Снягурачка:** Вам за гэта — ледзянцы. *(Раздае цукеркі.)*

**Дзед Мароз:** Падарунак атрымае,
Хто танцуе і спявае,
Хто на памяць верш раскажа
Або фокусы пакажа.
*(Пачынаецца самадзейнасць.)*

**Чараўнік:** Ціха, дзеці!
Свой паход
Пачынае

**Усе:** Новы год!

**Дзед Мароз:** Адчыняйце дзверы насцеж
У прастор пад зоркамі!
З Новым годам! З новым шчасцем!
З новымі пяцёркамі!
*(Уваходзіць Новы год.)*

**Новы год:** Я жадаю вам удачы,
Шчасця, міру на зямлі!
Каб рашаліся задачы!

**Айбаліт:** Каб здаровымі былі.

**Міколка-Паравоз:** Каб заўсёды кожны быў
Неадольны, дужы, смелы,
Каб Радзіму так любіў,
Як Казей і як Гастэла!

**Маленькі негр:** Каб для шчасця на планеце
Шчыра ўсе дружылі дзеці.



**Вясёлкін:** Запрашае Новы год
У святочны карагод.
*(Дзеці скачуць вакол ёлкі і пяюць.)*
Ёлачка, ёлачка,—
Мяккая іголачка,
Ты вясёлкаю свяці
Нам у радасным жыцці!
І настойлівым і смелым
Хутка стане кожны з нас,
Каб сумленным, каб умелым
Перайсці ў рабочы клас.



## УРАЧЫСТЫ ЗБОР

Вясна сагнала сіні лёд,
Набраклі вербы і шыпшыны,
Шуміць бусліны пералёт,
І не змаўкае спеў птушыны.
Над свежай цёплаю раллёй
Лапочуць жаўруковы крылы,
Дыміцца ранне над зямлёй
Зялёным красавіцкім пылам.
Ляцяць на золку журавы
За пушчы і за пералескі,
І ўжо з-пад леташняй травы
На ўзгорак выбеглі пралескі.
На плошчах сёл і гарадоў
Сцягі палошча свежы вецер.
Як першы гром: «Заўжды гатоў!»
Грыміць і коціцца па свеце.
У стэпах і ў цяснінах гор,
Пад небам сонечным і чыстым
Атрады на ўрачысты збор
Склікаюць юныя гарністы.
Праменні свецяцца ў вачах,
Надзеяй кожны акрылёны,
Бо ў гэты дзень да Ільіча
Ідуць, ідуць, ідуць калоны.
На ветры гальштукі гараць,
Клянуцца ленінцы ўрачыста
Вучыцца, вырасці і стаць
Надзейнай зменай камуністаў.
Вясна на плошчах і палях
Праклала сонечныя сцежкі,
І ўся зялёная зямля
Сагрэта ленінскай усмешкай.





## ЗМЕСТ

Сунічкі . . . . . . . . . . 3
Землякі . . . . . . . . . . 4
Знаходка . . . . . . . . . . 5
Партызанская зямлянка . . . 9
Жмуркі . . . . . . . . . . . 12
Пажарны . . . . . . . . . . 13
Кола . . . . . . . . . . . . 16
Дзяцел . . . . . . . . . . . 18
Млын . . . . . . . . . . . . 19
У лесе . . . . . . . . . . . 19
Ласяня . . . . . . . . . . . . . 20
Хто не спіць да рання . . . 22
Сонечная сцежка . . . . . . . 27
Лета . . . . . . . . . . . . 28
Сенакос . . . . . . . . . . . 29
Гусі . . . . . . . . . . . . . 30
Развітанне . . . . . . . . . 31
Пад чырвоным сцягам . . . 33
Карагод пад Новы год . . . 34
Урачысты збор . . . . . . . 40

**Сергей Иванович Граховский**

**СОЛНЕЧНАЯ ТРОПИНКА**

Стихи

Для детей младшего школьного возраста

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар Ул. Г. Машкоў. Мастацкі рэдактар М. Р. Казлоў. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Л. С. Зіза.

ІБ № 764

Здадзена ў набор 02.10.79. Падп. да друку 08.07.80. Фармат 84×100 1/16. Папера афс. № 2. Гарнітура часопісная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,90. Ул.-выд. арк. 3,17. Тыраж 80 000 экз. Зак. 2626. Цана 25 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Паліграфкамбінат імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Г (70802—158)/(М302(05)—80) 188—80 4803010000

Бел 2
Г 75

25 к.

